# Вёска Запур’е



# Вёска Запур’е. Парэцкі сельсавет

Трагічна склаўся лёс вёскі Запур’е, што знаходзіцца недалёка ад Парэчча.

Тую жудасную суботу, 18 верасня 1943г., жыхары в. Запур’е запомнілі на ўсе  жыццё. 48 чалавек, сярод якіх былі старыя і дзеці, растралялі фашысты.

Недалёка ад Запур’я – у в. Чарнуха – было лясніцтва. Ляснічым быў немец па прозвішчу Фолькер, людзі звалі яго “мардабіцель”. За здзекі над людзьмі яго застрэлілі народныя мсціўцы. Жонка ляснічага хадайнічала перад самім Гітлерам аб помсце – патрабавала расстраляць 50 палякаў і літоўцаў. Яе просьбу выканалі. Знішчэнню належала 50 чалавек, якія насілі прозвішчы Бура і Церабей.

Раніцай паліцаі выгналі ўсіх на вуліцу. Жыхароў з прозвішчамі Бура і Церабей адвялі ў адзін бок, іншых – у другі. Выбралі некалькі мужчын і заставілі капаць яму. Затым усім загадалі легчы. Пачуліся стрэлы. Дзяцей не стралялі – кідалі жывымі. Стагналі цяжка параненыя, плакалі дзеці. Фашысты кінулі дзве гранаты, усё сціхла.

Да пяцідзесяці чалавек не хапала яшчэ некалькіх. Хтосьці падказаў фашыстам, што ў лесе жыве ляснік, таксама па прозвішчу Церабей, а ў яго дзве дачкі. Туды паслалі некалькі паліцаяў. Дачок дома не аказалася. Паліцаі загадалі ляснiку іх знайсці, сказалі, што яны патрэбны для ўліку. Ляснік прывёў дачок. Іх таксама расстралялі.

Былі два смельчакі, што хацелі ўцячы, але іх скасілі кулі паліцаяў, што былі ў засадзе.

Людзей закапвалі яшчэ жывымі. У студні, што была ў дзесяці кроках ад магілы, вада стала мутнай ад крыві.

Успаміны сведкаў той жудаснай раніцы.

«18 верасня 1943 года паліцаі выгналі ўсіх на вуліцу. Некалькіх мужчын прымусілі капаць яму. Загадалі выстраіцца шарэнгай бліжэй да краю. Пачуліся стрэлы. Дзяцей не стралялі – кідалі жывымі. Стагналі параненыя, плакалі дзеці. Фашысты кінулі дзве гранаты – і

стала ціха. Людзей закопвалі яшчэ жывымі. У студні, што знаходзілася за дзесяць крокаў ад агульнай магілы, вада стала каламутнай ад крыві. Самаму старэйшаму тады было 66 гадоў, а самаму малодшаму ўсяго 6 месяцаў».

Вось што распавядае жыхарка вёскі Даніловіч Г.К.

«Да вайны ў вёсцы налічвалася 41 двор і 155 жыхароў. Калі пачалася вайна, каля вёскі быў створаны партызанскі атрад. Мне ў той момант было 15 гадоў. У вёску прыехалі немцы. Яны падзялілі жыхароў на тры групы. Першая група – людзі, якіх адпраўлялі ў канцлагер, другая – тыя, хто быў расстраляны, і трэцяя – тыя, каго адправілі на працу ў Нямеччыну.

Мяне вывезлі ў канцлагер. Я вярнулася дадому ў канцы вайны. Вёска была спалена. Да вайны ў мяне былі сястра, тата і дзядуля. Пазней я даведалася, што мае родныя былі расстраляны. Толькі адзін чалавек, Хоха Уладзімір Иванавіч, застаўся ў жывых. У той час яму было 52 гады. Ён памёр 18 лютага 1954».

На месцы трагічных падзей у 1964 годзе ўстаноўлены абеліск.

Ахвяры фашызму в.Запурье:

ЦЕРЕБЕЙ Михаил 60
Елена 52
Альбина 15
Станислава 12

ЦЕРЕБЕЙ Сильвестр 36
Стефания 39
Ромуальд 8
Мечислав 6
Мария 3 года

ЦЕРЕБЕЙ Юлия 48 лет
Эмилия 20
Елена 18
Валентин 7
Феликс 12

БУРА Казимир 54
Елена 48

Анна 17
Ян 13

ЦЕРЕБЕЙ Левон 29
Станислава 24 года
Генрих 4
Мечислав 2

БУРА Агата 65 лет
Ромуальд 30
Владислав 29

БУРА Константин 41 год
Ана 38 лет
Агата 10
Янина 8
Мария 7
Ян 4 года

ЦЕРЕБЕЙ Антон 60 лет
Мария 50
Бронислав 18
Антон 13

ЦЕРЕБЕЙ Ядвига 62 года
Витольд 22
Антонина 18 лет

БУРА Ян 32 года
Владислава 29 лет
Эльжбета 7

БУРА Клеменс 54 года
Регина 62
Эльжбета 23
Левон 8
Чеслав 3 года

ЦЕРЕБЕЙ Михаил 65 лет
Агата 60

ЦЕРЕБЕЙ Михаил 60

Елена 52
Альбина 15
Станислава 12

ЦЕРЕБЕЙ Сильвестр 36
Стефания 39
Ромуальд 8
Мечислав 6
Мария 3 года

# Вёска Бабіна



## **Вёска Бабіна.** Парэцкі (раней Наварудскі) сельсавет

Вёска Бабіна стала прытулкам для байцоў і камандзіраў разбітых часцей Чырвонай Арміі.

У першыя дні пасля нападу гітлераўскай Германіі на СССР вёска Бабіна, што згубілася ў лясах паўночнай часткі Гродзенскага раёна, стала надзейным прытулкам для байцоў і камандзіраў разбітых часцей Чырвонай Арміі. Людзі дзяліліся з імі апошнім кавалкам хлеба, дапамагалі прайсці патаемнымі сцежкамі далей на ўсход.

Некалькі пазней жыхары вёскі сталі дапамагаць савецкім партызанам, якія ўжо вясной і ўлетку 1942 года правялі шэраг смелых аперацый. Так, 21 мая група лясных салдат пад кіраўніцтвам палітрука Ф. Раманенка спаліла стодвадцацімятровы мост на рацэ Дзітва. 28 чэрвеня партызаны ў колькасці 46 чалавек пад камандаваннем лейтэнанта А. Іванова разграмілі гарнізон гітлераўцаў у Азёрах, 16 ліпеня ўзарвалі чыгуначнае палатно на лініі Гродна-Вільня.

Адна з партызанскіх груп пад камандаваннем А. Патапава спынілася ў лесе за тры кіламетры ад Бабіна. У гэтай групе былі Віталь Сыты, яго жонка Любоў Зорка, інжынер Нагорны. У Бабіна яны прыходзілі па прадукты. Тут былі надзейныя сувязныя. Уладзімір Хоха і сакратар сельсавета Марыя Хоха. Але ў вёсцы знайшоўся здраднік. Ён данёс у Парэцкі ўчастак нямецкай жандармерыі на аднавяскоўцаў, якія дапамагалі партызанам, і назваў месца, дзе была партызанская зямлянка

31 снежня 1942 года на досвітку варожы атрад з'явіўся ў Бабіна, пасля чаго адправіўся да месца размяшчэння партызан. У поспеху аперацыі фашысты не сумняваліся. Яны разлічвалі акружыць і знішчыць партызанскую групу. Але план іх праваліўся. Падчас прачэсвання лесу нервы ворага не вытрымалі. Гітлераўцы адкрылі агонь па сваіх, прыняўшы іх за партызан. Вартавы падняў трывогу, і партызаны спешна адыйшлі. Уступаць у бой каля вёскі з большымі сіламі праціўніка не было сэнсу. Гітлераўцы, каб запалохаць насельніцтва і пазбавіць партызан народнай дапамогі, расстрэльвалі не толькі сем'і і сувязных, але і знішчалі цэлыя паселішчы.

Тады ж з'явіўся жудасны план знішчэння вёскі Бабіна. Яго падрыхтаваў начальнік жандарскага ўчастка ў Парэчча лейтэнант Эрых Портцыг. На досвітку 11 студзеня 1943 года атрад гітлераўцаў на чале з Портцыгам акружыў Бабіна. Усіх 48 жыхароў вёскі сагналі ў дом Казіміра Хохі і падзялілі на тры групы.

Адна з іх была асуджана. Людзей па адным падводзілі да абрыву каля дарогі і расстрэльвалі. Так загінулі настаўнік Аляксандр Хоха, яго жонка дэпутат сельсавета Любоў Хоха, сувязная партызан Марыя Хоха, 76-гадовы Селівестр Хоха і яго 67-гадовая жонка Кацярына. Настала чарга ісці да абрыву і Уладзіміру Хоху. Гітлеравец штурхнуў яго ствалом аўтамата ў спіну: маўляў, чаго стаіш, нядоўга засталося. Уладзімір узяў пад руку бацьку Паўла і сказаў: «Пойдзем разам, бацька». Павольна наблізіліся да абрыву, за якім праз дарогу адкрыўся малады хвайняк. Уладзімір ірвануўся наперад і неўзабаве схаваўся за абрывам. Яшчэ адно імгненне, і яго, цяжка параненага, схаваў лес.

Раз'юшаныя фашысты схапілі і тут жа расстралялі сына ўцекача, 10-гадовага Генадзя, і сына суседа, 12-гадовага Віталя. Усяго ж знішчылі ў той дзень 14 чалавек, 12 адправілі ў турму ў Гродна, дзе неўзабаве мужчын расстралялі, а жанчын павезлі на катаржныя работы ў Германію. Толькі тры сям'і пазбеглі расправы. Іх акупанты выселілі з вёскі. Хаты і гаспадарчыя пабудовы разабралі на дровы, а маёмасць разрабавалі.

Эрых Портцыг трыумфаваў. У сваім данясенні ў Гродна пасля расправы над мірнымі жыхарамі Бабіна ён запэўніў, што, несумненна, наступіць спакой у раёне. Але ўрачыстасць карніка была заўчасная. Партызанскі рух з кожным днём пашыраўся, ўмацоўвалася сувязь партызан з насельніцтвам. Атрад, які спрабавалі знішчыць гітлераўцы ў лесе каля вёскі Бабіна, неўзабаве вырас у грозную сілу для фашыстаў – у партызанскую брыгаду імя Ленінскага камсамола.

Ахвяры вёскі Бабіна

1. Хоха Аляксей Паўлавіч, 1898 г.н.
2. Хоха Віталій Аляксеевіч, 1930 г.н.
3. Хоха Генадзь Уладзіміравіч, 1931 г.н.
4. Хоха Казімір Паўлавіч, 11892 г.н.

5. Хоха Марыя Казіміраўна, 1920 г.н.
6. Хоха Міхаіл Казіміравіч, 1930 г.н.
7. Хоха Надзея Іванаўна, 1894 г.н.
8. Хоха Павел Іосіфавіч, 1868 г.н.
9. Хоха Яўгенія Мікалаеўна, 1908 г.н.
10. Янковіч Аляксандр Сільвестравіч, 1893 г.н.
11. Янковіч Кацярына Вікнцьеўна, 1878 г.н.
12. Янковіч Любоў Фамінічна, 1904 г.н.
13. Невядомы
14. Невядомы